СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Комуністычная партыя (большавікоў) Беларусі.

# СТАЛІНЕЦ

ОРГАН ГРЭСКАГА РК КП(б)Б

№ 10 (741) | Серада, 16 лютага | 1944 г.

**ПРАЧЫТАЎ, ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ**

У ночы на 11 лютага вялікая група нашых самалётаў зрабіла масіраваны налёт на фінскі партовы горад Котка.

У выніку бамбардыроўкі ўзнікла многа пажараў, якія суправаджаліся сільнымі выбухамі.

2 нашых самалёты не вярнуліся на свае базы.

## Біце немцаў іх-жа зброяй

Немцы, часова захапіўшы Беларусь, хацелі пакарыць беларускі народ, але гэта не выйшла. Беларускі народ устаў са зброяй у руках у грозную сілу для немцаў.

На савецка-германскім фронце б'е ненавісных акупантаў гераічная Чырвоная Армія, у Італіі б'юць немца нашы доблесныя саюзнікі англічане і амерыканцы. Гітлераўцы зараз не могуць справіцца і на фронце і ў тылу, а паэтаму яны праводзяць павялічэнне паліцэйскіх участкаў.

Пад страхам расстрэла яны заганяюць гвалтоўна нашых людзей у паліцыю і пасылаюць іх са зброяй супроць сваіх-жа братоў. За апошні месяц гітлераўцы гвалтам загналі да сябе на службу звыш сотні працоўных раёна.

Працоўныя раёна! Ведайце, што блізак час нашага вызвалення, немцаў ніхто не выратуе ад гібелі. Ваша задача — не з'яўляцца на выклік на службу ў паліцыю, а ісці ў партызанскія атрады і помсціць немцам за здзекі, учыненыя імі над нашым народам. Калі вас гвалтоўна загналі на службу ў паліцыю,— атрымаўшы зброю, забівайце немцаў і пераходзьце да партызан. Гэтым вы захаваеце сваё жыццё і жыццё сваёй сям'і.

А хто астанецца з немцамі, —той загіне, як здраднік Радзімы, як гнусны нямецкі паслугач.

Усе на барацьбу супроць ворага, забівайце акупантаў іх-жа зброяй, гэтым мы прыблізім доўгачаканы час свайго вызвалення ад нямецкага прыгнёта.

## З аператыўных зводак Совінформбюро

(З 9-га ПА 16 ЛЮТАГА)

Войскі Ленінградскага фронта, працягваючы развіваць наступленне, авалодалі горадам ЛУГА, раённымі цэнтрамі Ленінградскай вобласці Батецкае, Ораджэж, а таксама з баямі занялі звыш 130 населеных пунктаў. Войскі гэтага фронта, наступаючыя ўздоўж узбярэжжа Чудскога возера і на ўсход ад яго, занялі райцэнтры Ленінградскай вобласці Гдоў, Поўна, Ляды і звыш 800 другіх населёных пунктаў. Нашы войскі поўнасцю ачысцілі ад праціўніка ўсходняе ўзбярэжжа Чудскога возера.

Войскі 1-га Украінскага фронта авалодалі горадам і вялікім чыгуначным вузлом ШЭПЕТОЎКА. У баях за горад нашы войскі разграмілі вялікія сілы праціўніка. На вуліцах горада падлічана 3.200 варожых трупаў, 47 спаленых танкаў і 12 самаходных гармат.

Паўночней Звенігародка і Шпола нашы войскі працягвалі весці баі па знішчэнню акружанай групіроўкі праціўніка і, зламаўшы яго супраціўленне, авалодалі райцэнтрамі Кіеўскай вобласці г.г. Корсунь-Шаўчэнкоўскі, Гарадзішча.

Захадней Апосталава нашы войскі з баямі занялі 40 населёных пунктаў.

Паўночна-захадней і захадней Нікопаль нашы войскі авалодалі райцэнтрам Днепрапятроўскай вобласці Чкалава.

На другіх участках фронта—артылерыйска-мінамётная перастрэлка і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

За 7 дзён баёў на ўсіх франтах падбіта і знішчана 671 нямецкі танк і збіта 358 самалётаў праціўніка.

## У вызваленых раёнах

За час з 20 жніўня 1943 г. па 1 студзеня 1944 г. вызваленыя ад нямецка-фашысцкіх акупантаў раёны атрымалі 1.723.201 галаву жывёлы.

*** Па пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б) звыш аднаго мільёна гаспадарак вызваленых раёнаў аслабонены ад усіх відаў паставак сельгас. прадуктаў дзяржаве.

*** У вызваленых раёнах адноўлена і ўноў пабудавана звыш 326 тыс. дамоў, у якіх зараз жывуць 1 млн. 800 тыс. калгаснікаў, рабочых і служачых.

*** Па дзяржаўнаму бюджэту на 1944 год на аднаўленне гаспадаркі ў вызваленых раёнах адпушчана 16 мільярдаў рублей.

## За граніцай

Войскі саюзнікаў у Італіі працягваюць весці баі ў раёне гарадоў Касіно і Анцыо.

*** Магутныя амерыканскія сілы зрабілі высадку на Маршальскіх астравах на Ціхім акіяне. Не гледзячы на сільнае супраціўленне японцаў, амерыканцы на астравах развіваюць паспяхова.

КОЛЬКІ ТЫ ЗАБІЎ НЕМЦАЎ?

## Б'ю і буду біць бязлітасна

Больш 2-х гадоў, знаходзячыся ў партызанскім атрадзе, я помшчу нямецкім варварам за іх гнусныя, незлічоныя здзекі над нашым народам, за кроў і слёзы бацькоў, мацярэй і дзяцей. За гэты час не адзін немец ад пасла ай маімі рукамі кулі аставіў свае чорныя косці на нашай зямлі.

У баю пад Жылін-бродам, дзе было знішчана 3 аўтамашыны праціўніка і забіта да 70 нямецкіх салдат і афіцэраў, я першы захапіў у праціўніка кулямёт і адкрыў з яго агонь па немцах. У баю з карнай экспедыцыяй ў вёсцы Амговічы Слуцкага раёна асабіста, ва ўпор расстраляў начальніка паліцэйскага ўчастка і цяжка параніў другога гітлераўца. Пры наступленні на варожы ДЗОТ у раёне вёскі С. Г. зняў на масту 2-х часавых немцаў.

Адзін раз я быў пасланы ў разведку, дзе знаходзіўся паліцэйскі ўчастак. На краю вёскі я забіў часавога паліцэйскага, забраў яго вінтоўку і пісталет. Імклівым браском, на грэйдэрнай дарозе З.-М. с пад нямецкіх куль схапіў жывём і даставіў у партызанскі атрад нямецкага служаку -добраахвотніка.

Аднойчы, будучы на спецыяльным заданні ў вёсцы А., я адзін на працягу 40 мінут трымаў бой з цэлай групай карнікаў.

Я прымаў удзел у многіх другіх баявых аперацыях, у разгроме нямецкага гарнізона на магістралі М.-З., у знішчэнні 25 мастоў, у спуску пад адхос нямецкага воінскага эшалона.

Я б'ю і буду біць гітлераўцаў да поўнага выгнання іх з нашай зямлі.

ПРАСЯНОЙ,
разведчык энскай брыгады.

## Вас вашы дзеці пракліянуць

У цяжкі час, у час суровы
Служыць вы к врагу пайшлі.
Вы здрадзілі братам па крові,
Радзімай здрадзілі зямлі.
Звязаліся з фашысцкім катам,
Служыць пайшлі ў варожы стан,
Узялі аружжа супроць брата,
Супроць сваіх-жа партызан.
Вас ненавідзяць усе, як катаў,
Вас праклінае брат-баец:
Ў крыві бацькоў, сясцёр і матак
Вы рукі мыеце свае.
Калі надыйдзе час расплаты,
Куды вы пойдзеце тады?
І вас, як ворагаў праклятых,
Гнаць будуць сёлы, гарады.
Нідзе не будзе вам ратунку,
Паслугачы драпежнікаў-звяроў!
Народ прад'явіць вам рахункі
За вамі выпітую кроў.
Браты ніколі вам не прасцяць,
Вам смерці цяжкай не мінуць.
Народ сурова вам адпомсціць,
Вас вашы дзеці пракліянуць...
Яшчэ ў вас ёсць шлях адзіны—
Знішчайце, як і мы, фашысцкі
зброд!
Тады даруе вам савецкая Радзіма,
Тады даруе вам народ.

Я. ПРАДВЕСНЫ.

Кула—начальнік грэскай паліцыі і Шараеў—начальнік банды забойцаў са скуры лезуць, каб угадзіць нямецкім нягоднікам.




Можаш добра тут убачыць,
Як даюць ім хлеб сабачы.
Вось Шараеў—пёс лягавы
Ліжа фрыцавы халявы.
Кула, падняўшыся на лапкі,
Ліжа рукі і азадкі.
З фашысцкага падмостку
Ім на справу даюць костку.

РЭДКАЛЕГІЯ.

## Леонід помсціць ворагу

Народны мсціве́ц атрада імя В. камсамолец Леонід М. адзначаецца рашучасцю і смеласцю ў баявых аперацыях.

За час сваей баявой дзейнасці ён шэсць разоў удзельнічаў у баях супроць гітлераўцаў, з'яўляецца ўдзельнікам складанай і дзёрзкай аперацыі па разгрому нямецка-паліцэйскага гарнізона ў населёным пункце Т.

Авалодаўшы падрыўной справай, ён некалькі разоў мініраваў шасе, знішчыўшы 3 нямецкіх аўтамашыны і звыш 20 гітлераўцаў, акрамя параненых.

Леонід два разы асабіста замініраваў чыгуначнае палатно. На мінах узарвана 2 паравозы, знішчана 9 вагонаў з ваенным грузам і 12 вагонаў з жывой сілай праціўніка, якія ішлі да лініі фронта.

За баявыя здольнасці Леонід М. назначан камандзірам аддзялення.

Цёплая дружба, гатоўнасць дапамагчы таварышу ў любую мінуту небяспекі, скромнасць —вось яго якасці.

В. Г.

## Як я забіў немца

Нямецкія карнікі разам з прадажнымі сабакамі-паліцэйскімі, ўварваўшыся ў вёску К. хацелі спаліць яе. Гэта стала вядома энскаму партызанскаму атраду. Партызаны ў баявым парадку падышлі да самай вёскі і адкрылі па гітлераўцах агонь. Пад свістам партызанскіх куль гітлераўцы ўцякалі з вёскі, пакідаючы забітых і параненых сваіх салдат.

У гэты час я нарваўся на нарансцага, ляжачага з вінтоўкай, немца, раптоўна кінуўся на яго, ударыў карабінам па галаве і прывёў яго ў беспрытомнасць.

Забраўшы вінтоўку і з'ясдабіўшы фрыца, я ўшоў у партызанскі атрад.

ВАЛОДЗЯ Х.

Выданне Грэскага РК КП(б)Б • Друкарня газеты „Сталінец“.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі